**ЛЯШУК** Вера Якаўлеўна [нар. 1. 11. 1933, в. Марозавічы Брэсцкага р-на], літаратуразнавец, педагог і метадыст. Кандыдат педагагічных навук (1975). Заслужаны работнік вышэйшай школы (1987). Прафесар (1991).

Пасля заканчэння Малазаводскай сямігадовай школы скончыла Брэсцкае педвучылішча (1954) і Брэсцкі педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна (1959). Настаўнічала. З 1963 г. працуе на кафедры беларускай літаратуры Брэсцкага педінстытута. З 1980 па 1985 г. дэкан філалагічнага факультэта.

Выкладчыцкую дзейнасць В. Я. Ляшук увесь час спалучае з навукова-даследчыцкай. Яна актыўна займаецца пытаннямі літаратурнага краязнаўства і методыкай выкладання літаратуры ў школе, праблемамі метадычнай падрыхтоўкі студэнтаў-філолагаў.

В. Я. Ляшук – аўтар шматлікіх метадычных дапаможнікаў для настаўнікаў: “Матэрыялы для пазакласнай работы па беларускай літаратуры (з Л. П. Смальянавай, 1971), “Краязнаўчы матэрыял на ўроках літаратуры” (1980), “Іван Мележ у школе” (1981), “Урокі пазакласнага чытання: IV–VII класы” (1984), “Вывучэнне эпічных твораў 5–8 кл.” (1987), “Літаратурнае краязнаўства ў школе” (1991), “Міжпрадметныя сувязі пры выкладанні беларускай мовы і літаратуры” (з Г. М. Малажай, 1992), “Вывучэнне трылогіі Якуба Коласа “На ростанях у школе” (2001) і інш.

Студэнтам філалагічных факультэтаў адрасаваны вучэбныя дапаможнікі “Лабараторныя заняткі па методыцы выкладання беларускай літартатуры” (1988), “Методыка выкладання беларускай літаратуры ў школе (даваенны перыяд)” (1994), “Методыка выкладання беларускай літаратуры” (сааўтар і рэдактар, 1986, 1999).

Пад кіраўніцтвам В. Я. Ляшук была распрацавана праграма, падручнікі і метадычныя дапаможнікі па беларускай літаратуры для сярэдняй школы ў адпаведнасці з прынятай ў 1991 г. канцэпцыяй літаратурнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ